Пралетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і аблвыканкома.

Год выдання другі.

№ 73 (142) ПЯТНІЦА 29 САКАВІКА 1940 г.

Цана 10 капеек

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ЛЮБОЎНА ВЫРОШЧВАЦЬ КАДРЫ САМАДЗЕЙНАГА МАСТАЦТВА

Партыя, урад і асабіста таварыш Сталін штодзённа клапоцяцца аб развіцці мастацтва ў нашай краіне. Работнікі культуры і мастацтва ў нас акружаны бацькоўскімі клопатамі. І гэта не выпадкова. Мастацтва з'яўляецца адным з важнейшых участкаў соцыялістычнага будаўніцтва, дзейным сродкам уздыму культуры народных мас. Яно дасягнула ў Совецкім Саюзе нябачанага росквіту. Нідзе, ні ў адной краіне свету, няма такіх шырокіх магчымасцей і вялікіх перспектыў для развіцця сапраўды народнага, соцыялістычнага па зместу і нацыянальнага па форме, мастацтва, як у СССР.

Шляхецкі абцас ва ўмовах былой панскай Польшчы бязлітасна мяў і душыў не паспеўшыя расцвісці народныя таленты. Польскія заправілы, як агню, баяліся праяўлення творчай ініцыятывы працоўных. Ні аб якім праніканні на «Парнас мастацтва» прадстаўнікоў народа не магло быць і гутаркі. На самім «Парнасе» сярод вядомых імён панавала беспрацоўе і творчы занапад.

Толькі зараз, пад яркім сонцам Сталінскай Канстытуцыі, вызваленыя народы заходніх абласцей Беларусі атрымалі ўсе магчымасці, каб разам з ўсёй сям'ёй шчаслівых совецкіх народаў паднімаць сваю культуру, тварыць мастацтва, вартае сталінскай эпохі. З самых нізоў паднімаюцца і расцвітаюць пышнай кветкай народныя таленты.

Праходзіўшая на працягу трох дзён алімпіяда мастацкай самадзейнасці ў Гродне выявіла і паказала нямала здольных, таленавітых людзей, якія пры ўмовах ўпартай вучобы і работы над сабой, могуць папоўніць рады прафесіянальных работнікаў мастацтва. Хор з 80 чалавек г. Крынкі пад кіраўніцтвам тав. Белова за кароткі перыяд вырас у моцны, згуртаваны ансамбль таленавітых спевакоў. Праявілі сябе танцавальны калектыў мястэчка Індуры, хор мястэчка Скідзель, хор вёскі Дубна і інш. На алімпіядзе вылучыліся індывідуальныя выканаўцы: 55-гадовая танцорка Соф'я Паўлаўна Лапа, баяніст Лысенка, спявачка Крашэвіч Сара, дэкламатар Леў і інш.

Падрыхтоўка да абласной алімпіяды мастацкай самадзейнасці выклікала вялікі творчы ўздым у абласці. Арганізаваны сотні мастацкіх калектываў, на-стойліва рыхтуюцца індывідуальныя выканаўцы. Бельскі раён асабліва вызначаецца разнастайнасцю самадзейнага мастацтва. Хор вёскі Грабоўцы гэтага раёна атрымаў на раённым прагляндзе прэмію за выдатнае выкананне народных і совецкіх песень. 2.400 рублёў прэміі атрымаў зводны хор г. Бельска, які налічвае ў сваім саставе 63 здольных выканаўцаў.

Добрай ацэнкі заслугоўвае мастацкая самадзейнасць мястэчка Саколкі. Аднак у сельсоветах гэтага раёна ніхто не займаецца вырошчваннем кадраў самадзейнага мастацтва. Райком комсамола стаіць у баку ад гэтага важнейшага пытання. Многія гурткі, не маючы кваліфікаваных кіраўнікоў, не могуць распачаць работу.

Толькі што закончыўшаяся алімпіяда беластоцкіх тэкстыльшчыкаў з'яўляецца яркім сведчаннем найвялікшых творчых магчымасцей у народзе. Тэкстыльшчыкі і прадзільшчыцы, радавыя рабочыя і інжынеры ўпершыню ў сваім жыцці выступалі са сцэны перад вялікай аудыторыяй і дэманстрыравалі свае здольнасці, мастацтва вызваленага народа. Хор 1-га тэкстыльнага камбіната пад кіраўніцтвам тав. Закса, які заваяваў першынства на алімпіядзе, мае ў сваім саставе многа здольных, таленавітых спевакоў. Прэміі атрымалі драматычныя калектывы 8 і 7 камбінатаў і драматычная студыя клуба тэкстыльшчыкаў. Таленавітым было выступленне музыканта-рабочага Кракуса.

Аднак, побач з добрымі прыкладамі арганізацыі мастацкай самадзейнасці мы маем яшчэ рад раёнаў, дзе вырошчванню кадраў, стварэнню належных умоў для развіцця іх здольнасцей не ўдзяляецца дастатковай увагі. У Дамброўскім раёне ёсць многа здольных людзей, але яны не маглі прадэманстрыраваць свае здольнасці з-за... адсутнасці інструментаў. У вёсках гэтага раёна зусім не арганізавана мастацкая самадзейнасць і раён не будзе прадстаўлен на абласной алімпіядзе.

Мы маем нямала прыкладаў, калі дырэкцыі прадпрыемстваў, профсаюзы, замест усялякай дапамогі і падтрымання самадзейных калектываў, перашкаджаюць апошнім у рабоце. Куды гэта варта, калі дырэктар 5 тэкстыльнага камбіната забараніў частыя рэпетыцыі гуртка.

Комсамол і профсаюзы павінны ўсур'ёз заняцца справай выяўлення і вырошчвання народных талентаў, справай шырокага разгортвання мастацкай самадзейнасці ў нашай абласці.

Абласная алімпіяда мастацкай самадзейнасці, якая сёння пачынаецца ў Беластоку, бясспрэчна, з'явіцца яркай дэманстрацыяй творчых магчымасцей вызваленага народа, дэманстрацыяй пышнага росквіту самадзейнага мастацтва пад яркім сонцам Сталінскай Канстытуцыі.

Беларускі народ у маі гэтага года будзе паказваць сваё мастацтва, свае дасягненні ў Маскве, перад правадыром народаў таварышам Сталіным. Абласная алімпіяда павінна адабраць лепшыя мастацкія сілы для ўдзелу ў дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве. Яна павінна з'явіцца паваротным момантам на шляху любоўнага вырошчвання кадраў самадзейнага мастацтва.



Перадвыбарчы мітынг у Беласт... сакавіка. (Фота Сапір).

Аб рэзультатах выба... Вярхоўны Совет СССР ад заходніх абласцей У...скай ССР і Беларускай ССР

24 сакавіка 1940 г. прайшл... бары ў Вярхоўны Совет ССС... выбарчых акругах заходніх аб... Украінскай ССР і Беларускай...

Выбары адбыліся па ўсіх ... барчых акругах па выбарах ... Саюза і па ўсіх 12 выбарчы... гах па выбарах у Совет Нац... насцей.

Акруговымі выбарчымі ...мі зарэгістравана выбранне ...55 дэпутатаў у Вярхоўны Сов...Р. Усе выбраныя дэпутаты з'...ца кандыдатамі блока комуніс...ес- партыйных.

Па спісках выбаршчык...ягo было зарэгістравана 7.96... вы- баршчыкі. Прымала ўдзел ...аса- ванні па выбарах у Сов...юза 7.894.971 чалавек, аль...9,09 процанта і па выбарах ...овет Нацыянальнасцей—7.89...ала- век, альбо 99,10 процант...гуль- най колькасці зарэгістра... вы- баршчыкаў.

Ва ўсіх 43 выбарчых...ах па выбарах у Совет Саюза за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных галасавала 7.743.210 чалавек, што састаўляе 98,07 процанта ўсяго ліку выбаршчыкаў, якія ўдзельнічалі ў галасаванні. Бюлетэняў, прызнаных несапраўднымі на аснове арт. 90 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР», аказалася 8.132. Бюлетэняў, у якіх закрэслены прозвішчы кандыдатаў,—143.629.

Ва ўсіх 12 выбарчых акругах па выбарах у Совет Нацыянальнасцей за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных галасавала 7.743.965 чалавек, што састаўляе 98.07 процанта ўсяго ліку выбаршчыкаў, удзельнічаўшых у галасаванні. Бюлетэняў, прызнаных несапраўднымі па аснове арт. 90 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР», аказалася 8.955. Бюлетэняў, у якіх закрэслены прозвішчы кандыдатаў,—142.941.

(ТАСС).

Рэзультаты в...аў у Вярхоўны Совет БССР ад Баранав..., Беластоцкай, Брэсцкай, Вілейска... Пінскай абласцей БССР

(Публікуецца па дань...ыманых Сакратарыятам Прэзідыума Вярхоўнага Совета Беларус...СР ад акруговых выбарчых камісій).

Усяго па заходніх ...х Беларускай ССР маецца 3...ыбарчых участкаў і 202 вы... акругі па выбарах у Вярх...овет Беларускай ССР.

К 14 гадзінам 2...віка быў закончан падлік ... па ўсіх акругах. Па даных ...овых выбарчых камісій зар...вана выбранне ўсіх 202 д...ў Вярхоўнага Совета Белар... ССР. Усе выбраныя дэпутат...яюцца кандыдатамі сталінск...ока комуністаў і беспарты...

Па Баранавіц...Беластоцкай, Брэсцкай, Вілейск... Пінскай абласцях зарэгістр... 2.930.628 чалавек, маючых... голаса на выбарах у Вярхо...овет Беларускай ССР. У гала... на выбарах у Вярхоўны Со...СР прынялі ўдзел 2. 909. ... выбаршчыкаў, што састаўляе ... процанта ад агульнай колькасці грамадзян, якія маюць права голаса.

Ва ўсіх выбарчых акругах па выбарах у Вярхоўны Совет Беларускай ССР за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных галасавалі 2.850.406 чалавек, што састаўляе 97,97 процанта ўсяго ліку ўдзельнічаўшых у галасаванні.

Бюлетэняў, прызнаных несапраўднымі на аснове «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет Беларускай ССР», аказалася 2.183. Бюлетэняў, у якіх закрэслены прозвішчы кандыдатаў,—56.861.

Колькасць выбаршчыкаў павялічылася ў параўнанні з выбарамі ў Народнае Сабранне Заходняй Беларусі на 167.437 чалавек, колькасць прымаўшых удзел у галасаванні павялічылася на 237.170 чалавек.

Да калгаснікаў Беластоцкай абласці

ПІСЬМО КАЛГАСНІКАЎ СЕЛЬГАСАРЦЕЛІ «ПУТЬ К СОЦИАЛИЗМУ» КАЗАХСКАЙ ССР

Калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі „Путь к социализму", Зеленоўскага раёна, Заходняга Казахстана, Казахскай ССР прыслалі на імя калгаснікаў Беластоцкай абласці пісьмо. У сваім пісьме яны пішуць:

— Дарагія таварышы! 24 сакавіка вы ўпершыню ў сваім жыцці выбіралі сваіх прадстаўнікоў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР. Разам з вамі мы, калгаснікі сельгасарцелі „Путь к социализму", радуемся вашым поспехам, вашаму новаму і шчасліваму жыццю. Вялікі совецкі народ, вызваліўшы адзінакроўных братоў беларусаў і украінцаў з-пад ярма памешчыкаў і капіталістаў, разам з вамі, нашымі роднымі братамі, пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна цяпер будуе комуністычнае грамадства.

Набліжаецца веснавая сяўба. Мы, калгаснікі, сустракаем яе ва ўсеўзбраенні, добра падрыхтаванымі. На нашых палях вясною будзе працаваць 10 трактараў. Мы засеем 2.200 гектараў розных культур. Мы абавязваемся правесці сяўбу на выдатна, яшчэ шырэй разгарнуць соцыялістычнае спаборніцтва імені 20-годдзя Казахскай рэспублікі, якое споўняецца 4-га кастрычніка гэтага года.

Мы заклікаем вас шырока разгарнуць соцыялістычнае спаборніцтва за высокі сталінскі ўраджай, своечасова падрыхтаваць насенне, сельскагаспадарчы інвентар, збрую, каб па-большэвіцку правесці першую совецкую вясну.

Мы просім вас напісаць нам пісьмо і расказаць, як вы рыхтуецеся да сяўбы.

Калгаснікі сельгасарцелі „Путь к социализму":

П. Крыпкін, Жукалін, Калягіна, Чакліна, Чэкалін, Пятроўская, Жылдбакоў, Істомін, К. Корк, Паўлава, Шыравітаў і іншыя.

ВАЛКАВЫСКІ РАЁН НАПЯРЭДАДНІ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ

На тэрыторыі Валкавыскага раёна калісьці было 22 памешчыцкіх маёнткі. У іх было 12.358 гектараў самай лепшай зямлі. Сяляне-ж мелі мізэрныя надзелы. Зараз уся памешчыцкая зямля перададзена батрацкім, бядняцкім і серадняцкім сялянскім гаспадаркам. Не прыдзецца больш сялянам паліваць гарачым потам чужую зямлю.

У вёсках раёна арганізавалася 5 калгасаў, у якія ўступіла 270 батрацкіх, бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак. З моманту арганізацыі калгасы дружна ўзяліся за падрыхтоўку да першай большэвіцкай вясны. Поўнасцю засыпан насенны фонд. Падрыхтоўваецца цягавая сіла і сельгасінвентар.

У раёне арганізавана і рэгулярна працуе 13 зернаачышчальных обозаў па ачыстцы насення, якія абслугоўваюць калгасы і сялянскія гаспадаркі. Гэтыя зернаачышчальныя абозы ачысцілі больш 900 цнт. аўсу, 700 цнт. ячменю, 230 цнт. пшаніцы і 24 цнт. насення канюшыны калгасаў, 830 цнт. аўсу, 400 цнт. ячменю, 40 цнт. пшаніцы сялянскіх гаспадарак.

У раёне арганізавана 26 кузняў, з іх 4 калгасныя грамадскія. Тут рамантуецца ўвесь сельскагаспадарчы інвентар калгасаў і сялян.

З вялікім энтузіязмам сустракае сялянства першую совецкую вясну.

В. Авілаў

ЛЕКЦЫІ ПА АГРАТЭХНІЦЫ ДЛЯ СЯЛЯН

Аграномы Саколкаўскага зямельнага аддзела правялі ў вёсках рад лекцый па пытаннях агратэхнікі. У вёсцы Бахматаўка аграномы т.т. Максімовіч і Жыжнеўскі прачыталі лекцыі на тэмы: „Апрацоўка глебы пад яравыя культуры", „Падрыхтоўка насення" „Спосабы сяўбы і нормы высеву", „Хваробы і шкоднікі сельскагаспадарчых культур", „Веснавы догляд за пладовымі дрэвамі".

Сяляне праяўляюць вялікі інтарэс да агратэхнічных ведаў. На лекцыі ў вёсцы Бахматаўка прысутнічала 45 чалавек. Больш 15 чалавек прышлі на лекцыю з вакольных вёсак. Пасля лекцыі было задана многа пытанняў, на якія лектар даў вычарпальныя адказы.

Такія-ж лекцыі праведзены ў вёсках Купліскі, Янова, Здроева і іншых.

А. Федасенка

АБ АДКРЫЦЦІ ШОСТАЙ СЕ... ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

Адкрыццё Сесіі Совета Саю... за адбудзецца сёння, 29 сака... віка, у 2 гадзіны дня, у зале па... сяджэнняў Вярхоўнага Совет... СССР у Крэмлі.

Адкрыццё Сесіі Совета Нацыянальнасцей адбудзецца сёння, 29 сакавіка, у 4 гадзіны дня, у зале пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР у Крэмлі.

НАРОДНЫЯ ВЫБРАННІКІ ЗАХОД... АБЛАСЦЕЙ БЕЛАРУСІ Ў МАСКВЕ

28 сакавіка ў Маскву на ад... крываючуюся сёння VI Сесі... Вярхоўнага Совета СССР пры... былі выбраныя 24 сакавіка дэ... путаты Вярхоўнага Совет... СССР ад заходніх абласцей Бе... ларусі. Сярод прыехаўшых ... былы рабочы, а зараз намесні... старшыні Беластоцкага аблвы...канкома тав. Прытыцкі, інжынер тав. Турлейскі, работніца тав. Дз'ячук, намеснік старшыні Брэсцкага гарадскога выканаўчага камітэта тав. Саўчук, былы селянін-бядняк, зараз інспектар земаддзела тав. Стома і іншыя.

(ТАСС).

ПА СОВЕЦКАМУ САЮЗУ

СТАХАНА... ПРАДПРЫ... ЕМСТВАЎ ...АНДЫДАТЫ НА ЎСЕС... ...НУЮ СЕЛЬ... СКАГАС... ...РЧУЮ ВЫ... ...КУ

ГОРКІ. А...дам ім. Молатава вылучаны к...амі на Ўсесаюз... ную сельскаг...рчую выстаўку 98 лепшых пера... вытворчасці. Сярод іх — бы...валі, цяпер студэнты Прамыс...акадэміі ім. Л. М. Кагановіча, ...г Вярхоўнага Совета СССР т...ыгін, тт. Фаустаў, Велікжанін, ...ннікаў і інш.

У ліку к...таў на выстаўку — знатныя ст...кі тт. Генералава і Струкова, ...біліся ўзорнай налад... кі станко...

ВЕС...АЯ СЯЎБА ...ПОЎДНІ

У краі...ыцца фронт вясенніх палявых ...Да 20 сакавіка калгасы паўднёвы...ублік Саюза засеялі яравымі ...рамі 953,1 тысячы гектараў. У ...ўступіў Дагестан, Кабардзін...рыя і Краснаярскі край.

В. Палянка.



Паспяхова ажыццяўляецца сталінскі план рэканструкцыі Масквы.

На здымку: Паточна-скараснае будаўніцтва жыллёвых дамоў на вул. (Фота-кліша ТАСС).

З ХУТАРОЎ — У КАЛГАСНЫЯ ЦЭНТРЫ

Сельскагаспадарчы банк СССР адкрыў на 1940 год крэдыты калгаснікам на перасяленне з хутароў у калгасныя цэнтры. У мінулым годзе ў калгасныя цэнтры перасялілася з хутароў больш 300 тысяч калгасных двароў. Многім з іх дзяржава аказала вялікую дапамогу ў выглядзе крэдытаў на абзавядзенне жыллём і гаспадаркай на новым месцы.

У бягучым годзе Сельскагаспадарчы банк адпускае крэдыты таксама праўленням калгасаў на ўпарадкаванне калгасных цэнтраў, у многіх месцах якія значна разрастаюцца ў сувязі з перасяленнем туды калгаснікаў з хутароў. Крэдыты выдаюцца на будаўніцтва студняў, грамадскіх лазняў, паляпшэння пад'ездных шляхоў, азеляненне, будаўніцтва клубаў, дзіцячых ясляў і іншых гаспадарчых пабудоў.

(ТАСС).

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

У АБКОМЕ КП(б)Б

Бюро абкома КП(б)Б на сваім пасяджэнні абмеркавала пытанне падрыхтоўкі да выбараў кіруючых партыйных органаў. У прынятай пастанове па гэтаму пытанню бюро абкома ўказала, што выбары кіруючых парторганаў павінны быць праведзены ў поўнай адпаведнасці з пастановай ЦК ВКП(б) ад 29 жніўня 1939 года «Аб правядзенні выбараў партыйных органаў у пярвічных, раённых і гарадскіх партыйных арганізацыях» і інструкцыяй ЦК ВКП(б) аб правядзенні выбараў.

Выбары павінны прайсці пад знакам праверкі выканання партыйнымі арганізацыямі рашэнняў XVIII з'езда ВКП(б), рашэнняў ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б, па пытаннях работы ў заходніх абласцях БССР, пад знакам далейшай мабілізацыі мас на паспяховае выкананне рашэнняў XVIII з'езда ВКП(б), палітычных і гаспадарчых задач, якія стаяць перад партыйнымі арганізацыямі.

Важнейшай задачай абласной, усіх раённых, гарадскіх і пярвічных арганізацый у прадстаячых выбарах з'яўляецца, на аснове шырокага разгортвання большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі, няўхільнага захавання ўнутрыпартыйнай дэмакратыі, выбранне ў састаў кіруючых партыйных органаў поўнасцю правераных, беззаветна адданых партыі большэвікоў, здольных да канца абараняць справу комунізма.

З 1 па 8 красавіка 1940 года павінны быць праведзены справаздачна-выбарчыя сходы пярвічных партыйных арганізацый з абвесткай дня:

1. Справаздача сакратара аб рабоце пярвічнай партарганізацыі.
2. Выбары бюро, сакратара пярвічнай партарганізацыі і яго намеснікаў.
3. Выбары дэлегатаў на раённую — гарадскую канферэнцыю.

З 8 па 15 красавіка ў Аўгустоўскім, Бельскім, Граеўскім, Замбраўскім, Ломжынскім раёнах павінны быць праведзены раённыя, а ў гарадах Беластоку і Гродна — гарадскія партыйныя канферэнцыі, у астатніх раёнах — раённыя партыйныя сходы.

Для раённых — гарадскіх партканферэнцый і раённых партсходаў рэкамендуецца наступная абвестка дня:

1. Справаздача аб рабоце райкома, гаркома КП(б)Б.
2. Выбары райкома, гаркома КП(б)Б.
3. Выбары рэвізійнай камісіі.
4. Выбары дэлегатаў на 1-ую абласную партыйную канферэнцыю. Нормы прадстаўніцтва на абласную партканферэнцыю: 1 дэлегат з правам рашаючага голаса ад 20 членаў партыі і 1 дэлегат з дарадчым голасам ад 100 кандыдатаў у члены партыі.

Партарганізацыя дзяржбанка напярэдадні справаздачна-выбарчага схода

Перад нашай партарганізацыяй з самага пачатку існавання абласной канторы дзяржбанка стаяла вялікая работа. Патрэбна было забраць усе каштоўнасці, якія асталіся ад польскіх банкаў, падабраць неабходны штат работнікаў і к [...] снежня арганізаваць бесперабойную работу канторы. З гэтай работай мы справіліся нядрэнна ва ўстаноўлены тэрмін.

Не адзін участак работы ў канторы, не адно пытанне гаспадарчага і палітычнага характару не вырашаецца без удзелу і актыўнай дапамогі членаў партарганізацыі.

Профарганізацыя канторы з першых дзён існавання праводзіць вялікую работу сярод работнікаў канторы. Соцыялістычным спаборніцтвам ахоплены амаль усе члены профарганізацыі. 70 чалавек заключылі паміж сабой індывідуальныя дагаворы на ўзорную работу і 79 чалавек — групавыя дагаворы.

У канторы выпускаецца насценгазета. Яна дапамагае ў рабоце канторы банка, партарганізацыі, мясцкому.

Комсамольская арганізацыя канторы дзяржбанка налічвае 9 чалавек. Усе комсамольцы актыўна ўдзельнічалі ў правядзенні выбараў у Вярхоўныя Советы. Многія з іх былі членамі выбарчых камісій, даверанымі і агітатарамі.

Асоавіяхімаўская арганізацыя налічвае толькі 11 членаў і не расце за лік работнікаў канторы. Слабая работа асоавіяхімаўскай арганізацыі тлумачыцца зусім недастатковай дапамогай і кіраўніцтвам з боку партыйнай арганізацыі. Мы не абмяркоўвалі становішча абароннай работы ў канторы, не дапамагалі маладой асоавіяхімаўскай арганізацыі ў наладжванні яе работы.

За прайшоўшыя два месяцы партарганізацыя ўсю сваю ўвагу аддавала падрыхтоўцы і правядзенню выбараў. 18 чалавек членаў і кандыдатаў партыі працавалі на выбарчых участках. На 45 выбарчым участку Чырвонаармейскай выбарчай акругі працавала 7 членаў партыі і тры комсамольцы нашай арганізацыі. Старшынёй участковай выбарчай камісіі гэтага ўчастка працаваў тав. Савін. Рэзультаты выбараў паказваюць, што яны нядрэнна выконвалі сваё даручэнне.

Захапіўшыся гаспадарчай работай і падрыхтоўкай да выбараў, наша партарганізацыя ўпусціла важнейшае пытанне ўнутрыпартыйнай работы. Мы ні аднаго разу не абмяркоўвалі пытання партыйнай вучобы, работу комуністаў над сабой па павышэнню свайго ідэйна-палітычнага ўзроўню. У рэзультаце гэтага частка таварышоў не працавала над сабой.

А. В. Жукоўскі,
сакратар парткамітэта абласной канторы банка.

[Б]еластоцкая тэкстыльная прамысловасць у 1940 годзе

Пастановай Совета Народных Камісараў СССР і Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) беластоцкая тэкстыльная прамысловасць у 1940 г. павінна даць Совецкай краіне 10 з [...] [...]вай мільёнаў метраў суконных [тка]нін, што перавышае аб'ём вы[творчасці] прамысловасці за апош[нія] 5—6 год на 50 процантаў. Та[кіх] тэмпаў росту вытворчасці не [...] і не можа ведаць прамысло[васць] любой капіталістычнай кра[іны].

[...]прыемствы, якія праводзяць [партыя] і ўрад па развіццю аўцага[доўлі] і тэхнічных культур у краіне, [...]ечылі шарсцяную прамысло[васць] Саюза магутнай базай сыра[віны]. Трэба мець на ўвазе, што [...]ная прамысловасць дарэвалю[цыйнай] Расіі (таксама як і Бела[стоцкая]) была ў поўнай залежнасці ад [...]іх рынкаў сыравіны. Увоз [...]ы складаў 98 процантаў.

[У су]часны момант мы поўнасцю [вызвалі]ліся ад імпарта шарсцяной [сыравіны]. Больш таго, дзяржаўны ба[ланс сы]равіны шарсцяной прамыс[ловасці] на 1940 г. можа поўнасцю [забяспе]чыць беластоцкую прамысло[васць].

[...] натуральна, што ў баланс [...] шарсцяной прамысловасці трэба ўключыць рэсурсы [...] сыравіны заходніх абласцей [Бе]ларусі і Украіны. Гэтыя [...] дастатковай меры на сёння яшчэ не даследваны. [Па ары]ентыровачных даных, у [заходніх] абласцях БССР можна [нарыхтаваць] каля 500 тон воўны (у [пераліку н]а мытую), з якой каля 80 [проц. т]рубай і 20 проц. поўгру[б]ай. Гэта колькасць за[бяспечыць] [...] па тонкай і грубай [беластоцкую] прамысловасць [...] процанты. Таму неабходна першачарговую задачу [...] пытанне аб развіцці аўцагадоўлі ў заходніх абласцях Беларусі і Украіны, таксама як яно [вырашана па] ўсяму Совецкаму Саюзу [...] напрамку якаснага і колькаснага развіцця пагалоўя.

Ста[...] баланса сыравіны СССР [...], аднак, дапусціць ні[якіх ...] [...]каў сыравіны ў 1940 годзе. [...]т, беластоцкая тэкстыльная [пра]мысловасць павінна забяспечыць [ма]ксімальна эканомнае расходаванне [сы]равіны, выконваючы і перавыконваючы свае вытворчыя заданні [...]ючы аб неабходнасці з[...]ння на канец года астатка[ў] [...]ны.

Гэта [...]іць далейшы рост аб'ёму в[ытворчас]ці ў 1941 годзе, бо шарсцяная [пра]мысловасць да вясенняй за[гатоўкі в]оўны, г. зн. да 1 ліпеня ко[...] года, працуе на рэсурсах [...]і, якія асталіся на 1 студзеня.

Па гэты[х р]азлічаннях, план 1940 года [...]годдзях разлічан на захава[нне ў п]ершым паўгоддзі дасягнутага [на 1 с]тудзеня 1940 г. узроўню за[гружанасці а]бсталявання, павялічваючы [...] процантаў аб'ём вытворчасці [у другі]м паўгоддзі.

Першыя [месяцы] 1940 года далі ў сва[ім выні]ку выкананне плана па пр[адзенню] на 129 проц., па ткацтву — на 115 і па аддзелцы—на 68 проц.

Рэзкае адставанне выканання плана па гатоваму тавару мела месца ў выніку несвоечасовай адгрузкі для Беластока фарбаў і хімікатаў, што выклікала прастоі аддзелачных цэхаў.

Адгрузка ў апошнія тыдні, асабліва натуральнай воўны, сведчыць аб паступовым паляпшэнні справы забеспячэння сыравінай нашай прамысловасці.

Дзве дэкады сакавіка далі наступнае выкананне плана: па прадзенню —120 проц., па сураўю — 112 проц., па гатоваму тавару —129,5 проц.

У сучасны момант трэстам ужо закончана распрацоўка плана другога квартала. Асноўнай задачай гэтага плана з'яўляецца перавод усіх прадпрыемстваў на новы асартымент тканін, замест старога тавару, які ў першым квартале вырабляўся з запасу старой пражы.

Практыка работы прадпрыемстваў трэста над унядрэннем новага асартымента паказала велізарныя магчымасці выпрацоўкі складанага і разнастайнага тавару. Прадстаіць вялікая работа над асваеннем новых асартыментаў.

Сам аб'ём вытворчасці другога квартала па ўзроўню сутачнай выпрацоўкі ў параўнанні з планам першага квартала павялічваецца на 6,5 процанта. Гэты рост вытворчасці павінен быць забяспечан існуючай на фабрыках колькасцю рабочай сілы. Для гэтага неабходна шырэй разгарнуць соцыялістычнае спаборніцтва і стаханаўскі рух.

У першым квартале 1940 года мы маем значны рост колькасці спаборнічаючых рабочых. Зараз ахоплена соцспаборніцтвам 2.355 чалавек.

Адной з форм соцспаборніцтва, узнікшай па ініцыятыве перадавых рабочых, з'яўляецца пераход на многастаночную сістэму. На 1-е лютага налічвалася 110 двухстаночнікаў, у тым ліку 82 ткачы і 28 маталак. На 1-е сакавіка было ўжо 98 ткачоў і 39 маталак-многастаночніц.

У другім квартале намечана двухтыднёвая астаноўка прадпрыемстваў на рамонт, што забяспечыць [т]эхнічную падрыхтоўку да росту вытворчасці ў другім паўгоддзі. [Г]эта абавязвае ўсіх кіраўнікоў [п]радпрыемстваў своечасова падрых[т]авацца да рамонту, забяспечыўшы [ф]абрыкі неабходнымі матэрыяламі.

Работа тэкстыльных прадпрыем[с]тваў за невялікі перыяд з моманта [а]рганізацыі дзяржаўнай прамысло[в]асці паказала, што беластоцкія [т]экстыльшчыкі могуць з чэсцю вы[ко]нваць пастаўленыя перад імі за[да]чы.

Аднак нельга не адзначыць не[ка]торыя арганізацыйныя недахопы [ў] кіраўніцтву прадпрыемствамі і па[к]раванню самім тэхналагічным пра[ц]эсам. Вельмі слаба пастаўлен на [п]радпрыемствах пярвічны ўлік. [Г]эта пазбаўляе магчымасці правя[д]ення аналіза работы прадпрыем[с]тваў для выпраўлення існуючых [п]амылак.

Дырэктары і галоўныя інжынеры [п]радпрыемстваў недастаткова звяр[т]аюць увагі на арганізацыю статы[ст]ычнай справаздачнасці. Не на[ла]джана фінансавая дысцыпліна на [ф]абрыках.

Зразумела, што і сама работа [тр]эста і дырэктыўных арганізацый [ма]е рад недахопаў. Павінны быць [тэ]рмінова вырашаны пытанні аб за[ра]ботнай плаце, рэжымах работы [пр]адпрыемстваў, напрамку і канкрэт[на]й рабоце па капітальнаму будаў[ні]цтву і пытання забеспячэння да[да]можным матэрыялам.

Усе кіраўнікі прадпрыемстваў па[ві]нны памятаць, што першы арганізацыйны перыяд работы дзяржаўнай [пр]амысловасці Беластока праходзіць, [і] партыя і ўрад патрабуюць ад нас [чо]ткай і наладжанай работы.

План будучага 1941 года праду[гл]еджвае рост вытворчасці на 70 [пр]оц. супроць плана 1940 года. [Та]кі велізарны рост зусім рэальны.

Далейшае развіццё стаханаўскага [р]уху, соцспаборніцтва і ўдарніцтва, [м]асавы ахоп тэхнічнай вучобай ра[б]очых-тэкстыльшчыкаў павінны за[б]яспечыць выкананне задач, якія [па]стаўлены перад беластоцкай тэк[ст]ыльнай прамысловасцю партыяй і [ўр]адам.

І. Гінзбург,
начальнік планавага аддзела тэкстыльтрэста.



Былы батрак Пулькоўскі Антон [п]рыходам Чырвонай Арміі атрымаў 4 гектары зямлі, карову і прыгожую кватэру з двух пакояў у панскім доме. (в. Залясяны, Беластоцкага раёна).

На здымку: тав. Пулькоўскі з сям'ёй у новай кватэры. (Фота Сапір).

Важная задача асоавіяхімаўскіх арганізацый

15 красавіка пачнецца рэалізацыя білетаў XIV Усесаюзнай латарэі Асоавіяхіма. Працоўныя Беластока разам з усімі працоўнымі нашай краіны прымуць актыўны ўдзел у гэтай важнай кампаніі, накіраванай на далейшае ўмацаванне абароназдольнасці краіны соцыялізма.

Рэалізацыя латарэйных білетаў будзе праводзіцца на працягу трох месяцаў: з 15 красавіка па 15 ліпеня. Поспех гэтай кампаніі залежыць ад падрыхтоўкі да яе пярвічных арганізацый Асоавіяхіма і ад канкрэтнай дапамогі ім з боку партыйных, комсамольскіх і профсаюзных органаў. Усю работу па распаўсюджванню білетаў трэба спалучыць з далейшым уздымам усёй абароннай работы на прадпрыемствах і ўстановах, правядзеннем разгорнутай масава-растлумачальнай работы.

XIV усесаюзная латарэя Асоавіяхіма дасць у фонд умацавання абароны нашай краіны 200 мільёнаў рублёў.

Галоўныя выйгрышы латарэі легкавая машына «ЗІС-101», 18 аўтамабіляў «М-1», 35 двухмесных матацыклаў, 40 аднамесных матацыклаў, 49 піяніна, 59 падарожжаў па Совецкаму Саюзу, 132 двухствольных стрэльб, 165 фотаапаратаў «ФЭД», 372 веласіпеды.

Вялікай перавагай будуць карыстацца трымацелі 5-рублёвых білетаў. Самы буйны выйгрыш па гэтых білетах складае 27 тысяч рублёў, а самы малы — 100 рублёў. Па трохрублёвых білетах самы буйны выйгрыш — 10 тысяч рублёў, а самы малы — 60 рублёў. Па рублевых білетах самы буйны выйгрыш — 1.500 рублёў, а самы малы — 20 рублёў.

Значэнне гэтай латарэі не вычэрпваецца толькі фінансава-матэрыяльнай стараной справы. Асноўная задача латарэі гэта ўзняць на вышэйшы ўзровень работу ўсіх асоавіяхімаўскіх арганізацый.

Не павінна быць ніводнай асоавіяхімаўскай арганізацыі, дзе-б член таварыства не набыў білетаў латарэі!

Да пачатку кампаніі асталіся лічаныя дні. Трэба шырока разгарнуць падрыхтоўчую работу, уцягнуўшы ў яе актывістаў, агітатараў, якія паказалі ўзоры работы сярод працоўных у час выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР.

Справа чэсці кожнай партыйнай, комсамольскай, профсаюзнай і асоавіяхімаўскай арганізацыі — правесці кампанію па распаўсюджванню білетаў XIV латарэі Асоавіяхіма ўзорна і ў найкарацейшы тэрмін.

С. Гудзееў,
загадчык ваенным аддзелам Беластоцкага гаркома КП(б)Б.

Жыццё і рэвалюцыйная дзейнасць А. М. Горкага

(Выстаўка ў Беластоцкім Доме Чырвонай Арміі)

28 сакавіка споўнілася 72 годы з дня нараджэння вялікага рускага пісьменніка, геніяльнага майстра слова, беззаветнага друга працоўных, палкага барацьбіта за комунізм Алексея Максімавіча Горкага.

У сувязі з гэтай датай у Беластоцкім Доме Чырвонай Арміі адкрыта выстаўка «Жыццё, творчасць і рэвалюцыйная дзейнасць А. М. Горкага», арганізаваная па ініцыятыве Мінскага Дома Чырвонай Арміі Цэнтральным музеем А. М. Горкага пры Інстытуце сусветнай літаратуры імені Горкага.

Задача выстаўкі — раскрыць шматграннае жыццё Алексея Максімавіча, паказаць, як выхадзец з самых гушчаў народных мас, Алексей Пешкаў падняўся на вяршыны сусветнай культуры, стаў вялікім мастаком рабочага класа, як разам з партыяй Леніна—Сталіна рос і развіваўся магутны талент пісьменніка.

Ужо на першым стэндзе выстаўкі ў карцінах і рысунках мастакоў Успенскага, Дзегцярова і Белухі адлюстраваны дні цяжкага дзяцінства і юнацтва пісьменніка. Мы бачым нястрымныя імкненні Алёшы Пешкава да ведаў, да праўды жыцця, імкненні вырвацца з душнай атмасферы звярынага мяшчанскага быту ў сям'і яго дзеда В. Кашырына.

Пошукі «праўды жыцця» прыводзяць яго ў падпольныя рэвалюцыйныя гурткі. Вельмі хутка за ім устанаўліваецца тайная слежка паліцыі. У 1889 годзе на яго заводзіцца палітычная «справа», жоўтая вокладка якой выстаўлена на стэндзе. Горкі заточан у адной з вежаў Ніжнегародскай турмы, малюнак якой можна ўбачыць тут-жа побач з жандарскай «справай».

Шматгадовыя вандраванні «па Русі», цяжкая праца на гаспадара, адсідка ў царскіх турмах, пытлівае вывучэнне жыцця народа — былі тымі ўніверсітэтамі Алексея Пешкава, у якіх фарміравалася свядомасць рэвалюцыйнага мастака Максіма Горкага. У сваіх творах ён смела выкрывае дэспатыю царызма, бязлітасна зрывае маску з звярынай морды рускага капіталізма, аддана змагаецца за шчасце працоўнага народа. Горкі спявае хвалебную песню гераічным рэвалюцыйным сокалам. Усё гэта прыводзіць яго да цеснага і блізкага садружаства з ленінскай «Искрой», з большэвікамі.

Фарміраванню палітычных і літаратурных поглядаў А. М. Горкага прысвечаны другі стэнд выстаўкі.

Абагульненнем рэвалюцыйных настрояў А. М. Горкага, якія з'яўляюцца адлюстраваннем растучай рэвалюцыйнай энергіі перадавога рускага грамадства, з'явілася «Песня аб Буравесніку», якая выклікала новую хвалю рэпрэсій у адносінах да А. М. Горкага з боку царскай паліцыі. І тады Ленін у «Искры» выступае з абаронай А. М. Горкага як «еўрапейскі вядомага пісьменніка».

Бурныя дні рэвалюцыі 1905 года, першая сустрэча А. М. Горкага з В. І. Леніным — усё гэта паказваюць экспанаты IV стэнда. Выступленні А. М. Горкага ў рэвалюцыі 1905 года, яго непасрэдны ўдзел у гэтых падзеях, выкананне адпаведных партыйных даручэнняў за граніцай пераконваюць у тым, што А. М. Горкі цвёрда ішоў толькі з большэвікамі-ленінцамі, непрымірыма выкрываючы меншавікоў і прымазаўшыхся да рэвалюцыі спадарожнікаў.

Мастацкім абагульненнем рэвалюцыйных уражанняў 1905—1906 гадоў у творчасці Горкага з'яўляецца раман «Маці». Асобны стэнд прысвечан гэтаму выдатнаму твору соцыялістычнай літаратуры. У наві[...]тры — вык[...] [...]тым рамане. [...]Леніна аб гэ[...] [...]аварыў аб ім:

«Кніга пат[рэбная ...] многа рабочых удзельнічала [...] [рэвалю]цыйным руху несвядома, ст[ыхійна, і] цяпер яны прачытаюць «[Маці]» з вялікай карысцю для сябе[...]і своечасовая кніга».

В. І. Ленін [...]е велізарнае палітычнае знач[энне] [гэ]тага рамана ў рэвалюцыйнай [барацьбе] рабочага класа.

Знаходзячыся [...] [эміграцы]і, А. М. Горкі па запраша[нні В]. І. Леніна прыязджае ў Лон[дан, дзе бярэ] ўдзел у работах V з'езда [...]. Тут дружба яго з Ільічом [яшчэ] больш умацоўваецца. Тут на[...] ён упершыню сустракаецца [з] Сталіным.

Далей 7-гадовае [знаходжа]нне ў эміграцыі на во[страве] Капры ў Італіі. Наведвальні[кі выст]аўкі ўбачыць шматлікія ар[...]ыя фатаграфіі, рысункі і [...]ты, якія характарызуюць гэт[ы пер]ыяд жыцця пісьменніка. Дво[йчы] яго ў госці прыязджае В. [І. Ленін]. Арыгінальная фатаграфія [...]ае Леніна, які адпачывае ў [...]у свайго друга.

Горкі, жывучы за [мяжой], актыўна ўдзельнічае ў [...]чай рабоце, супрацоўнічае [...]ыйным друку. Ён перапісваец[ца з Ле]ніным. Некаторыя дакументы пера[...]піскі можна ўбачыць на стэндах выстаўкі.

Напярэдадні імперыялістычнай вайны Горкі па парадзе В. І. Леніна вяртаецца ў Расію. Ён арганізуе журнал «Летапіс», у якім разгортвае актыўную антываенную прапаганду.

Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэвалюцыя. У цэнтры стэнда, прысвечанага Кастрычніку, ленінская і сталінская ацэнка гэтай сусветна-гістарычнай падзеі, якая пачынае новую эру ў гісторыі чалавецтва. Наведвальнік выстаўкі ўбачыць шматлікія дакументы і мастацкія матэрыялы, якія характарызуюць дзейнасць Горкага ў гэтыя годы. Разам з В. І. Леніным ён удзельнічае ў работах II кангрэса Комінтэрна. В. І. Ленін дарыць А. М. Горкаму кнігу «дзіцячая хвароба «левізны» ў комунізме» з уласнаручным надпісам «Дарагому Алексею Максімавічу Горкаму ад аўтара». Гэты дакумент выдатнай дружбы генія чалавецтва з найвялікшым соцыялістычным мастаком слова можна таксама ўбачыць наведвальнікам выстаўкі.

Горкі стварае шматлікія журналы, ён арганізуе рад выданняў, бярэ на сябе арганізацыю навуковай работы ў маладой Совецкай Рэспубліцы. Невычайна выразным дакументам з'яўляецца пісьмо прафесара Кост[...]ва, накіраванае Горкім Леніну з надпісам на ім рукой Леніна.

У 1921 годзе Горкі цяжка захварэў. І Ленін, сам хворы, настойліва раіць Алексею Максімавічу [Г]оркаму паехаць за граніцу лячыцца. «У Еўропе, у добрай санаторыі, [б]удзеце і лячыцца і ўтрая больш [с]правы рабіць»,—чытаем мы на [с]тэндзе словы Леніна з пісьма к [Г]оркаму.

Экспанаты наступнага стэнда па[ка]зваюць жыццё Горкага ў Італіі, [дз]е ён прабыў 7 год. Тут ён ства[рае] свае манументальныя творы: [«]Справа Артамонавых», «Жыццё [К]ліма Самгіна» (першы том). Не [гл]едзячы на тое, што многа тысяч [кі]лометраў аддзяляюць яго ад род[н]ай зямлі, ён усімі сваімі думкамі [і] пачуццямі жыве з нашай радзімай. Ён з вялікай увагай сочыць за грандыёзнымі поспехамі совецкага народа. Цікавыя фота паказваюць як жыў, працаваў і адпачываў Горкі ў Італіі, яны паказваюць [ш]матлікія сустрэчы яго з лепшымі [л]юдзьмі совецкай краіны, якія прыязджалі ў госці да свайго любімага [п]ісьменніка.

З велізарным натхненнем і любоўю сустракаюць працоўныя краіны Советаў прыезд Горкага ў СССР у 1928 годзе. Многалюдныя радасныя мітынгі запечатлены на фатаграфіях IX стэнда. Працоўныя віта[...]

Свае абавязацельствы выканалі

У часць выбараў Вярхоўных Советаў СССР і БССР калектыў 13 камбіната арганізаваў соцспаборніцтва. Мы абавязаліся датэрмінова выканаць квартальны план. Калектыў сваё слова стрымаў і да 24 сакавіка вытворчы план выканаў на 114 процантаў.

Прыклады добрай работы дае наш ткацкі цэх. Працуючы ў сярэднім на 51 станку замест 56, ён выканаў план на 112 проц. Ткач тав. Кесцін, які быў адным з лепшых агітатараў на ўчастку, працуючы на двух станках, дае штодзённа па 78—80 тысяч удараў. Такія-ж рэзультаты паказвае двухстаночнік Гельштэйн. Да пачатку выбарчай кампаніі абодва гэтыя ткачы давалі на станку толькі 32—33 тысячы ўдараў.

Такіх вынікаў яны дабіліся дзякуючы акуратнаму догляду за станкамі, своечасовай змазкай і рамонтам пашкоджанняў станкоў, максімальным зніжэннем прастояў.

Мы штодзённа адзначалі ход соцспаборніцтва паміж цэхамі і рабочымі на спецыяльнай дошцы. Гэта паслужыла магутным штуршком для паляпшэння работы. Стары ткач Мардзецкі, які раней лічыў, што для таго, каб даць работу добрай якасці, нельга гнацца за кольксацю, не даваў ніколі больш чым 32—33 тысяч удараў. Зараз, спаборнічаючы з маладымі ткачамі, ён перавыконвае дзённыя нормы, даючы 40 тысяч удараў.

Прадзільны цэх выканаў квартальны план на 128 проц. Майстар цэха тав. Фін правільна расставіў рабочых, навучыў іх добраму догляду за апаратамі, узначальваў соцспаборніцтва абодвух змен апаратнага цэха. Вось у чым „сакрэт" поспехаў прадзільнага аддзялення. Лепшыя паказчыкі сярод работніц прадзільнага цэха дае брыгада сельфактаршчыцы Антаніны Камінскай. Гэта брыгада значна перавыконвае нормы, даючы штодзённа па 200 кілаграмаў пражы.

Таксама выканаў свой квартальны план аддзелачны цэх. Рабочы сушыльнага цэха Аляксандр Каліш, які раней выпрацоўваў 42 кускі тавару, зараз дае 54 кускі.

За першы квартал мы выпусцілі 150 тысяч метраў гатовага тавару замест плана 142 тысяч.

Але гэтымі вынікамі мы не задавольваемся. Мы будзем змагацца за атрыманне пераходнага сцяга тэкстыльнага трэста, за тое, каб сустрэць вялікае ўсенароднае свята — 1-е мая — новымі вытворчымі перамогамі.

Л. Раксін,
дырэктар 13 камбіната.



На здымку: Танцавальны калектыў рабочых Беластоцкага чыгуначнага вузла ў час рэпетыцыі напярэдадні абласной алімпіяды мастацкай самадзейнасці. (Фота Сапір).

СЁННЯ ПАЧЫНАЕЦЦА АБЛАСНАЯ АЛІМПІЯДА МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ

ЗАКОНЧЫЛАСЯ АЛІМПІЯДА ТЭКСТЫЛЬШЧЫКАЎ

27 сакавіка — трэці і апошні дзень прагляду самадзейнасці тэкстыльшчыкаў. У праглядзе прымалі ўдзел 7, 12 і 5 тэкстыльныя камбінаты, 23 фабрыка і яўрэйская драматычная студыя клуба тэкстыльшчыкаў.

Драмгурток 7 камбіната (Супрасль) паказаў сцэнку Ульянава «На закінутай станцыі». Дзеянне адбываецца ў першыя месяцы рэвалюцыі на маленькай станцыі ў глыбіні краіны. Вяртаючыяся з фронта, салдаты царскай арміі пераходзяць на бок рэвалюцыі. Выдатна сыграў сваю ролю салдата - байца рабочы камбіната тав. Носаў. З глыбокім пачуццём паказаў ён псіхалогію цёмнага салдата - селяніна, адзінай думкай якога з'яўляўся зварот на сваю зямлю. Пры сустрэчы з уцякаючай буржуйкай у салдата прабуджаецца класавая нянавісць, і ён становіцца на бок рэвалюцыі, далучаецца да рэвалюцыянера — матроса.

Сёмы камбінат паказаў гледачам багаты і цікавы рэпертуар. Драматычны калектыў у саставе 17 чалавек прадэкламіраваў рад літаратурных мантажаў: «Правады», «Мы бальшавікі» і інш. Выкананне было арыгінальным і цікавым: увесь калектыў быў падзелен на групы, якія чыталі асобныя творы пад акампанемент хора.

Цёпла сустрэлі прысутныя выступленне хора 2 камбіната ў саставе 50 чалавек, пад кіраўніцтвам тав. Кучаковіча. Хор выканаў «Бей, барабан» Багуслаўскага, «Песню данскіх казакаў» і інш.

Лепшым нумарам веча была пастаноўка яўрэйскай драматычнай студыі клуба тэкстыльшчыкаў «Яўрэйскі Дон-Кіхот» Мендэлэ Мойхер Сфорым, дзе адлюстроўвае жыццё бедных, цёмных яўрэяў. Калектыў, які састаіць з 20 чалавек, аказаў яшчэ пастаноўку Штэйна «Лявароты». Харавая дэкламацыя «Поезда» была сустрэта дружнымі апладысментамі.

Драмкалектыў 2-га камбіната выканаў харавыя і індывідуальныя дэкламацыі. Уд дэкламіравалі вершы рабочы Леў і Рашко.

У фінале зводны : з усіх удзельнікаў прагля выканаў пролетарскі гімн «Інтэрнацыянал». У адзіны парыве ўсе прысутныя сталі і разам з хорам спя гэту выдатную песню.

Усяго на алімпія выступіла каля 350 чалавек. у абласной алімпіядзе б удзельнічаць 240 чалавек, ым ліку 12 калектываў.

Пяршынства на піядзе тэкстыльшчыкаў заў хор 1-га камбіната пад кі ніцтвам тав. Закса, які атрым першую прэмію. Прэміраван ксама драмгурток 8-га кам а пад кіраўніцтвам рабочаг Суда, драмгурток 7-га кам а пад кіраўніцтвам тав. уна, драматычная студыя а тэкстыльшчыкаў пад кіраўніцтвам тав. Ліпмана. Прэм за індывідуальнае выкана атрымаў рабочы 3-га кам а таленавіты музыкант тав. кус.

Л. Лірская.

ЗВЫШ ТЫСЯЧЫ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ АБЛАСНОЙ АЛІМПІЯДЫ

Па вобласці закончаны раённыя і гарадскія прагляды мастацкай самадзейнасці. На іх адабраны лепшыя сілы самадзейнага мастацтва для ўдзелу ў абласной алімпіядзе.

Усяго на абласной алімпіядзе будзе звыш тысячы ўдзельнікаў, у тым ліку 600 чалавек з вёсак, сёл і мястэчак. На алімпіядзе выступяць мастацкія калектывы і індывідуальныя выканаўцы Беластока, Гродна, Ломжы, Саколкі, Бельска, Аўгустова і інш. Усяго будзе прадстаўлена 15 раёнаў.

Журы алімпіяды складаецца з 26 чалавек — прадстаўнікоў аддзела мастацтваў, Дома народнай творчасці, партыйных і совецкіх арганізацый. У журы ўваходзяць таксама народны артыст рэспублікі Ільінскі, заслужаныя артысты БССР Малчанаў і Звездачотаў.

Алімпіяда будзе праходзіць у гарадскім тэатры і працягнецца тры дні.

Адначасова з алімпіядай у гортэатры будзе выстаўка народнай творчасці, на якой будзе прадстаўлена звыш 300 экспанатаў.

ПРАГЛЯДЫ МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ Ў ШКОЛАХ

27-га сакавіка ў школах горада пачаліся прагляды мастацкай самадзейнасці. За першыя два дні адбыліся прагляды ў васьмі школах, у тым ліку ў 8-ай, 14-ай і іншых. Да 15-га красавіка прагляды будуць закончаны.

У журы ўдзельнічаюць прадстаўнікі гаркома комсамола, настаўнікі, работнікі мастацтваў.

НАРОДНЫ ГЕРОЙ СЕРГЕЙ ЛАЗО

20 год таму назад паў смерцю храбрых адзін з адданейшых сыноў народа, бясстрашны камандзір Чырвонай Арміі Сергей Георгіевіч Лазо. На 26 годзе абарвалося цудоўнае жыццё народнага героя, які склаў галаву ў барацьбе за вызваленне Совецкай краіны ад белагвардзейшчыны і інтэрвентаў.

Яшчэ ў 1916 годзе, будучы прапаршчыкам ваеннага часу, Лазо, прызначаны ў Краснаярск, хутка заваяваў сабе любоў сярод салдат. Ён часта гутарыў з імі, цікавіўся іх жыццём, іх патрэбамі. Узвод, якім камандаваў Лазо, лічыўся шчаслівым узводам, бо ў іншых падраздзяленнях афіцэры адносіліся да салдат груба, здзекліва, па-барску. Пасля звяржэння самаўладства Лазо, выбраны па патрабаванню салдат ротным камандзірам, заявіў, што ён аддае сябе ў распараджэнне сфарміраваўшагася совета. Уся рота далучылася да свайго камандзіра.

У кароткі час Лазо стаў папулярнейшым кіраўніком салдацкіх мас краснаярскага гарнізона.

У снежні 1917 года Сергей Лазо быў накіраван у Іркуцк, дзе ў той час выбухнуў контррэволюцыйны мяцеж юнкераў. Ваенна-рэволюцыйны камітэт даручыў Лазо падавіць антысовецкае выступленне. З рэволюцыйнай энергіяй прыступіў Лазо да выканання гэтага баявога задання. Ён абучаў ваеннай справе чырвонагвардзейцаў, натхняў іх, увесь час знаходзячыся на лініі агню. Баі насілі жорсткі характар і закончыліся поўнай перамогай большэвікоў.

У студзені 1918 года інтэрвенты, сярод якіх найбольш актыўную ролю адыгрывалі японцы, дапамаглі бандыцкаму атаману Сямёнаву стварыць у Забайкаллі атрад з афіцэраў і кулачча. Сямёнаўскім бандам удалося захапіць частку Забайкалля да станцыі Алавяная. Пад пагрозай была Чыта, якая знаходзілася на адлегласці 100 вёрст ад ст. Алавянай.

Супроць Сямёнава быў паслан атрад на чале з Лазо.

Лазо звязваецца з чыцінскімі рабочымі-чыгуначнікамі, фарміруе баявыя адзінкі, чырвонаармейскія часці. Пад уплывам большэвіцкай прапаганды сялянства зразумела, якія мэты праследуе Сямёнаў, і пачало ўзнімацца на барацьбу з ненавісным атаманам. З розных гарадоў Сібіры сталі прыбываць рабочыя, якія ўліліся ў баявыя часці. Атрады папаўняліся палітработнікамі і камісарамі. 24-гадовы камандуючы фронтам Сергей Лазо нястомна працуе над умацаваннем дысцыпліны, ён змагаецца з анархічнымі настроямі, п'янствам і марадзёрствам. Палкі агітатар, ён растлумачвае рабочым і сялянам палітыку большэвіцкай партыі, адначасова вывучае ваенную навуку. «У Сямёнава,—гаварыў ён,—у стаўцы генералы і афіцэры, якія ведаюць ваенную справу; мы не павінны ім у гэтым уступаць...»

Барацьба з сямёнаўскімі бандамі была суровай і жорсткай. Першай сур'ёзнай перамогай чырвоных часцей было ўзяцце Алавянай. Сярод сямёнаўцаў пачалося разлажэнне.

Сямёнаў стаў адкатвацца да Манчжурыі. Армія, у якой, па выражэнню саміх сямёнаўцаў, быў «сабран увесь цвет доблеснага афіцэрства», не вытрымала націску чырвоных воінскіх часцей, кіруемых маладым камандуючым — большэвіком Сергеем Лазо.

Але ўперадзе яшчэ аставаліся вялікія цяжкасці.

Падтрымліваемыя імперыялістамі Францыі, Англіі, Амерыкі, на Сібір наступалі чэхі.

Ва Владзівастоку ў жніўні—верасні 1918 года высадзілася да 100 тысяч інтэрвентаў, у тым ліку да 72 тысяч японцаў.

Чэхі рухаліся да Чыты з боку Іркуцка і Владзівастока. Да іх далучаліся белагвардзейскія атрады. Пачуўшы здабычу, зноў заварушыўся ў Манчжурыі атаман Сямёнаў.

Партыя даручае Сергею Лазо камандаванне ўсімі партызанскімі сіламі Прымор'я. На барацьбу з інтэрвентамі падымаліся рабочыя. У партызанскія атрады ўліваліся сяляне цэлых вёсак, са зброяй у руках, якія ішлі ў тайгу. Партызаны пускалі пад адкос японскія эшалоны, узрывалі варожыя бронепаязды, захаплялі ў праціўніка патроны, абмундзіраванне, харчаванне. Лазо, як камандуючы, як верны большэвік, накіроўваў барацьбу партызан так, каб яна стала непарыўнай часткай агульнай барацьбы Чырвонай Арміі супроць інтэрвентаў і белагвардзейцаў.

Перамога асталася за большэвікамі. Прымор'е было ачышчана ад варожай нечысці.

Але японскія імперыялісты не склалі зброі. У ноч з 4 на 5 красавіка 1920 года яны арганізавалі ва Владзівастоку правакацыйнае выступленне і прыступілі да жорсткай расправы з працоўнымі. Адначасова японцы выступілі ў Нікольску, Спаску і Хабараўску. За два дні японцы забілі і ранілі звыш 5 тысяч чалавек; арыштаваных было яшчэ больш.

Сярод арыштаваных аказаўся і Лазо. Для яго азвярэўшыя драпежнікі прыдумалі страшэнную помсту: пасля мучыцельных катаванняў яго жывым спалілі ў распаленай топцы паравоза...

У росквіце сіл загінуў на баявым пасту герой-самародак, як называе Сергея Лазо сталінская «Гісторыя ВКП(б)». Але памяць аб гэтым народным героі будзе вечна жыць у сэрцах працоўных. Такія людзі, як Сергей Лазо, «натхняюць нашу моладзь на подвігі і гераізм і служаць цудоўным прыкладам бязмежнай адданасці свайму народу, Радзіме і вялікай справе Леніна—Сталіна». (Варашылаў).

Н. КОСЦІН.

АДКРЫЦЦЁ ВЫСТАЎКІ ЛІТОЎСКАЙ КНІГІ Ў МАСКВЕ

27 сакавіка ў Дзяржаўным музеі новага заходняга мастацтва адкрылася выстаўка літоўскай кнігі, арганізаваная Усесаюзным таварыствам культурнай сувязі з заграніцай. На выстаўцы сабрана каля тысячы разнастайных экспанатаў, якія даюць яркае ўяўленне аб развіцці нацыянальнай культуры літоўскага народа.

На адкрыцці выстаўкі прысутнічалі ўвесь састаў літоўскай місіі ў Маскве на чале з надзвычайным пасланнікам і поўнамоцным міністрам Літвы п. Л. Наткевічыус, надзвычайны пасланнік і поўнамоцны міністр Эстоніі п. А Рэй, надзвычайны пасланнік і поўнамоцны міністр Латвіі п. Ф. Коцыньш, чыны эстонскай і латвійскай місіі ў Маскве, дзеячы совецкай навукі і літаратуры, адказныя супрацоўнікі Наркамата Замежных Спраў і Усесаюзнага таварыства культурнай сувязі з заграніцай, прадстаўнікі друку.

Выстаўку адкрыў старшыня Усесаюзнага таварыства культурнай сувязі з заграніцай тав. В. С. Кеменаў, які выказаў упэўненасць, што выстаўка літоўскай кнігі несумненна паслужыць далейшаму ўмацаванню і развіццю культурных сувязей паміж прыязнымі народамі Совецкага Саюза і Літвы.

З вялікай прамовай выступіў надзвычайны пасланнік і поўнамоцны міністр Літвы п. Л. Наткевічыус, які зрабіў падрабязны агляд развіцця літоўскай пісьменнасці, нацыянальнай літаратуры і друку.

— Сёнешняя выстаўка, — гаворыць п. Наткевічыус, — з'яўляецца вынікам традыцыйнай дружбы, цесных палітычных узаемаадносін і культурнага супрацоўніцтва Літвы з Совецкім Саюзам.

У заключэнне п. Наткевічыус ад імені літоўскага ўрада перадаў удзячнасць урад СССР і падзякаваў Усесаю нае таварыства культурнай вязі з заграніцай і некат ых асоб, якія прымалі ўдз у арганізацыі выстаўкі літо скай кнігі ў Маскве.

юць свайго любімага пісьменніка і друга. Карта паездак Горкага па СССР гаворыць, з якой прагнасцю ён вывучае новае жыццё ў нашай краіне. Яго ён ярка паказаў у мастацкіх нарысах «Па Саюзу Советаў».

Усё больш умацоўваецца дружба Горкага з Сталіным. Рад фота паказваюць іх разам. Вось яны зняты ў кабінеце Алексея Максімавіча. Тут-жа і тав. К. Е. Варашылаў. У часадной з такіх гутарак. Горкі чытаў разім гасцям казку «Дзяўчына і смерць», напісаную яшчэ ў 1892 годзе. На старонцы кніжкі, дзе надрукаваны гэты твор, таварыш Сталін напісаў:

«Гэта штука мацней чым «Фаўст» Гётэ (любоў перамагае смерць).

І. Сталін
11/X 1931 г.»

Цяжка без хвалявання глядзець на гэты каштоўнейшы аўтограф, геніяльна вызначыўшы асноўнае зярно ўсёй творчасці Горкага.

Наведвальнік выстаўкі спыніцца ля стэнда, у цэнтры якога на аксамітнай падушцы захоўваецца ордэн Леніна. Гэты ордэн—высокая ўзнагарода, якой совецкі ўрад ацаніў найвялікшыя заслугі Горкага прад народам.

Шматгранна дзейнасць Горкага. Ён—кіраўнік нашай совецкай літаратуры. Пад яго кіраўніцтвам праходзіць першы Усесаюзны з'езд совецкіх пісьменнікаў. Клапатліва вырошчвае ён маладыя літаратурныя кадры. З якой дасканаласцю ён правіць рукапісы маладых, пачынаючых пісьменнікаў, якія прысылаюць яму свае першыя літаратурныя вопыты. Перад наведвальнікам выстаўкі адкрываюцца дзверы выдатнай лабараторыі выхавальніка пісьменнікаў.

Моцнай і непарушнай была дружба пісьменніка з нашай доблеснай Чырвонай Арміяй. Яго захаплялі выдатныя людзі, якіх выхоўвае наша армія, адзіная ў свеце, сапраўды народная армія. Хвалюючы шматлікія падарункі, прысланыя чырвонаармейцамі свайму другу. Асаблівую ўвагу прыцягвае адзін з іх, прысланы кавалерыстамі—ваенкорамі: шчотка, скарбніца і шпоры. Гэты падарунак невядомы паэт-кавалерыст суправадзіў наступнымі вершамі:

Кавалерысты—ваенкоры
Падарунак прыслалі такоў:
Шчотку, скарбніцу і шпоры.
Няхай чысціць свет ад барскай своры
Жалезам і шчацінай слоў.

З усёй праматой і непрымірымасцю Горкі выкрываў прошукі ворагаў нашай радзімы, здраднікаў і прадажнікаў ўнага народу. Ён вучыў нас: і вораг не здаецца, яго знішч . Гэтымі словамі вялікі пі ік праўзгаласіў асновы новаг ыялістычнага гуманізма, які бус палкай нянавісці да вор

Беззаветн рацьба Горкага за шчасце нар го гарачая любоў да радзімы ода, гордасць яго тым, што ле нашай партыі, на чале на стаяць такія правадыры, я кі Сталін—усё гэта выклікае смяртэльную нянавісць пра аў радзімы, трацкісцка-бухар х бандытаў. Перакванаўшыся м, што ніякімі правакацыям е ўдасца сцягнуць Горкага нскага шляху, гэтыя ашалеўш радкі ўтвараюць сваё страшэні злачынства: умярцвляюць га генія.

Адзін шніх стэндаў прысвечан тра гібелі Горкага. Мастак На ян запечатлеў незабываемы Горкага на смяротным адрэ. Ж я маска работы скульптара-ор сца Меркурава аднаўляе я рысы твара беззаветнаг а працоўных. Тут-жа партр аварышоў Кірава, Менжынс Куйбышэва, якія падобна Гс палі афярай ворагаў народ

Ж оркага — прыклад кожнаму кажаму патрыёту. Яго прадсмяротны заклік, якім завяршаецца прадапошні стэнд, звернут да ўсяго совецкага народа: «Жывіце дружна, таварышы, любіце вашу другую маці — магутную соцыялістычную нашу радзіму».

Ворагі народа пралічыліся. Горкі жыў. Ён жыве ў бессмяротных творах, створаных яго вострым, паражаючым пяром. Няма такога народа, які-б не ведаў Горкага. Няма такой мовы, на якой-бы не выдаваліся творы Горкага. Апошні стэнд выстаўкі прысвечан выданням твораў Горкага на розных мовах. Гледзячы на гэтыя выданні, паўтараеш услед за мудрым акынам Джамбулам:

«Ты, солнечный Горький, бессмертен в веках,
Во всех поколениях, на всех языках».

Выстаўка А. М. Горкага з'яўляецца вялікім фактарам у справе культурна-палітычнага выхавання мас.

Пазнаёміцца з жыццём Горкага, вывучыць яго—гэта значыць навучыцца страсна любіць радзіму, беззаветна змагацца за яе росквіт.

Г. Лявін, Н. Матвейчук,
навуковыя супрацоўнікі музея А. М. Горкага.

ЗА РУБЯЖОМ

НЕЗДАВАЛЬНЕННЕ КІРАЎНІЦТВАМ ЛЕЙБАРЫСЦКАЙ ПАРТЫІ

ЛОНДАН, 28 сакавіка. (ТАСС). Відны лейбарысцкі дзеяч графства Дархем сакратар профсаюзнага і лейбарысцкага совета горада Джэрору Раунас вышаў з радоў лейбарысцкай партыі і звярнуўся з просьбай аб прыняцці яго ў компартыю.

Раунас заявіў, што ён упэўнен, што лейбарысцкая партыя становіцца «адданейшым лакеем брытанскага імперыялізма». Раунас з'яўляецца членам муніцыпалітэта Джэрору.

—o—

ГЕРМАНА-ІТАЛЬЯНСКАЕ КУЛЬТУРНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

БЕРЛІН, 28 сакавіка. (ТАСС). У адпаведнасці з германа-італьянскім культурным пагадненнем ва універсітэтах Кельна і Мюнхена арганізуюцца дзве сталыя кафедры італьянскай культуры. У Берлінскім універсітэце будзе створана кафедра па этнаграфіі і геаграфіі Італіі. У школах уводзіцца вывучэнне італьянскай мовы. Ужо ў цяперашні час у 120 школах Германіі факультатыўна вывучаецца італьянская мова, а ў 44 школах вывучэнне італьянскай мовы з'яўляецца абавязковым. У вышэйшых школах уводзіцца ўрок італьянскай разгаворнай мовы.

—o—

СУСТРЭЧА ТЭЛЕКІ З МУСАЛІНІ

РЫМ, 28 сакавіка. (ТАСС). Агенцтва Стэфані паведамляе, што 27 сакавіка Мусаліні ў прысутнасці Чыана прыняў венгерскага прэм'ер-міністра Тэлекі, з якім меў двухгадзінную гутарку.

—o—

ПАВОДКА У ВЕНГРЫІ

БУДАПЕШТ, 28 сакавіка (ТАСС). У апошніх паведамленнях урадавага камісара па барацьбе з паводкай адзначаецца пагоршанне становішча ў радзе раёнаў і сур'ёзная пагроза гораду Хатван. Паводка зрабіла велізарныя спусташэнні ва ўсёй Венгрыі. Газеты прыводзяць новыя факты аб разбурэнні дамб, чыгуначных насыпаў, мастоў, шасейных дарог. Самыя ўрадлівыя раўніны краіны— пад вадой. Для барацьбы з паводкай прыцягнуты воінскія часці.

—o—

ГАЛАНДСКІЯ ЗНІШЧАЛЬНІКІ ЗБІЛІ АНГЛІЙСКІ БАМБАРДЗІРОЎШЧЫК

ЛОНДАН, 28 сакавіка. (ТАСС). Амстэрдамскі карэспандэнт агенцтва Рэйтэр паведамляе, што сёння галандскія знішчальнікі збілі паблізу Ротэрдама англійскі бамбардзіроўшчык. З пяці чалавек экіпажа адзін лётчык забіты і адзін ранены. Галандскі ўрад інтэрніраваў астаўшыхся жывымі.

НОВЫ ФІНЛЯНДСКІ КАБІНЕТ

Стокгольм, 28 сакавіка (ТАСС). Фінляндскае інфармацыйнае бюро перадае наступны састаў новага фінляндскага кабінета: прэм'ер — **Руці,** міністр замежных спраў — **Вітцінг,** юстыцыі — **Лехтонен,** унутраных спраў — **Фом-Борн,** ваенны—генерал-маёр **Вальдэн,** фінансаў—**Пекала,** асветы — **Куконен,** міністры земляробства — **Хэйкінен і Кайвіста,** міністры шляхоў зносін і грамадскіх работ **Саловаара і Экхольм,** міністр гандлю і прамысловасці — **Коцілайнен,** соцыяльнага забеспячэння — **Фагерхольм,** снабжэння — **Танер.**

Такім чынам з мінулага састава ўрада ў новы кабінет не ўвайшлі былыя міністр юстыцыі — **Седэргольм,** асветы — **Ханула,** ваенны — **Нюканен,** снабжэння — **Фіндт** і міністр без партфеля — **Паасіківі.**

НА ЗАХОДНІМ ФРОНЦЕ

БЕРЛІН, 28 сакавіка. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне германскай арміі паведамляе: «На захадзе — нічога новага». Некалькі англійскіх самалётаў беспаспяхова атакавалі гарманскія вартавыя судны ў германскай бухце. Германскія знішчальнікі збілі англійскі самалёт. Непрыяцельскія самалёты ў ноч на 28 сакавіка неаднаразова парушалі дацкую, галандскую, бельгійскую і люксембургскую тэрыторыі і пераляцелі германскую граніцу. Германская зенітная артылерыя збіла адзін англійскі самалёт. Частка экіпажа самалёта ўзята ў палон.

ПАРЫЖ, 27 сакавіка. (ТАСС). Агенцтва Гавас перадае, што «Германскае камандаванне праявіла вялікі інтарэс да размяшчэння французскіх войск на поўначы. У ноч на 26 сакавіка германскія самалёты рабілі многа палётаў, накіроўваючыся з пачатку ва Ўсходнюю, а адтуль у Паўночную Францыю. Днём яны лятали над Паўночнай Францыяй групамі ў 3, 7 і 13 машын. У раёне Саара лятала многа германскіх знішчальнікаў».

Па словах агенцтва, некалькі германскіх вайсковых злучэнняў перакідваліся з правага берагу Рэйна на левы.

На фронце, паведамляе далей агенцтва, была адзначана выключная актыўнасць артылерыі ў раёне рэк Мозель і Нід.

БРУСЕЛЬ, 27 сакавіка. (ТАСС). У ваенным аглядзе газеты «Журналь» ад 27 сакавіка гаворыцца: «Паміж Саарам і Вагезамі была адзначана інтэнсіўная артылерыйская перастрэлка. Французскія дальнабойныя гарматы вялі сёння стральбу па тылах праціўніка. Адзін снарад выклікаў узрыў склада за лініяй Зігфрыда».

Агенцтва Бельга паведамляе, што ўчора французская артылерыя бамбардзіравала Шнееберг.

ВАЙНА НА МОРЫ

ЛОНДАН, 28 сакавіка. (ТАСС). Міністэрства авіяцыі паведамляе, што ўчора ў час разведкі англійскіх самалётаў над Паўночным морам было патоплена германскае вартавое судно.

ЛОНДАН, 27 сакавіка. (ТАСС). Учора ў Паўночным моры быў патоплен адзін англійскі танкер «Дагестан» вадазмяшчэннем у 5.742 тоны. 16 чалавек з каманды высадзіліся на пабярэжжа Шатландыі. 4 чалавекі загінулі.

Англійскі параход «Кэстлмур» вадазмяшчэннем у 6.574 тоны, які даўно не прыбыў да месца назначэння, як мяркуюць, затануў.

Англійскі авіяносец «Арк ройял» звярнуўся на сваю базу пасля 5-месячнага рэйса па акіяну.

БЕРЛІН, 27 сакавіка. (ТАСС). Германскі параход «Альтмарк», які падвергся 16 лютага нападзенню з боку англійскіх ваенных караблёў, прыбыў сёння ў Кіль.

НЬЮ-ЙОРК, 27 сакавіка. (ТАСС). Галандскі траулер «Проціпус» наскочыў у Паўночным моры на міну і затануў. Англійскі ваенны карабль выратаваў 6 чалавек каманды. 8 чалавек прапала без вестак.

АБВЯРЖЭННЕ ГЕРМАНСКАГА ІНФАРМАЦЫЙНАГА БЮРО

БЕРЛІН, 28 сакавіка. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро абвяргае англійскае паведамленне аб тым, што быццам 27 сакавіка англічане збілі 5 германскіх самалётаў. Па сцвярджэнню адпаведных органаў, германская авіяцыя ў апошнія дні не страціла ніводнага самалёта. Несправядліва таксама паведамленне аб патапленні германскага вартавога судна.

НАРВЕЖСКІЯ УЛАДЫ ІНТЭРНІРАВАЛІ ГЕРМАНСКУЮ ПАДВОДНУЮ ЛОДКУ

ЛОНДАН, 28 сакавіка. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае, што нарвежскае міністэрства замежных спраў апублікавала паведамленне, у якім гаворыцца, што ў ноч на 27 сакавіка германская падводная лодка «У-21» села на мель паблізу Мандаля. Нарвежскія ўлады аддалі распараджэнне аб раззбраенні каманды і інтэрніраванні падводнай лодкі. Яна прыведзена ў Мандаль.

ЗВАРОТ УЭЛЕСА У ЗША

НЬЮ-ЙОРК, 28 сакавіка. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Асашыэйтэд Прэс, сёння Уэлес на барту італьянскага парахода «Контэдзі Савойя» прыбыў у Нью-Йорк. Пасля прыбыцця ў Нью-Йорк Уэлес неадкладна адправіўся ў Вашынгтон.

У гутарцы з прадстаўнікамі друку Уэлес заявіў, што ў Еўропе яму была дана поўная магчымасць для атрымання неабходнай інфармацыі.

—o—

ЗНЕШНІ ГАНДАЛЬ ЗША ЗА ЛЮТЫ

ВАШЫНГТОН, 27 сакавіка. (ТАСС). Міністэрства гандлю ЗША паведамляе, што экспарт ЗША за люты саставіў 346.699 тысяч долараў супроць 368.583 тысяч долараў у студзені і 218.682 тысяч долараў у лютым мінулага года. Экспарт за першыя два месяцы 1940 года састаўляе 715.362 тысячы долараў супроць 431.593 тысяч за той-жа перыяд мінулага года.

—o—

РАСКРЫЦЦЁ АНТЫЎРАДАВАГА ЗАГАВОРУ У БРАЗІЛІІ

НЬЮ-ЙОРК, 28 сакавіка. (ТАСС). Па паведамленню з Рыо-дэ-Жанейро (Бразілія), урад аб'явіў аб раскрыцці ў штаце Сан-Паола загавору, які меў сваёй мэтай звяржэнне ўрада Варгаса. Паліцыя захапіла 58 кулямётаў, а таксама ручныя гранаты і антыўрадавую прапагандысцкую літаратуру. Арыштавана вялікая колькасць загаворшчыкаў.

★ ★ ★

ЗАМЕЖНАЯ ХРОНІКА

Ва Францыі пачынаецца спецыяльны перапіс насельніцтва для выдачы прадуктовых картак. Другі перапіс будзе праведзен для раздачы картак на вугаль.

* * *

Рабочыя англійскай друкарні ў Шанхаі аб'явілі 27 сакавіка італьянскую забастоўку пратэсту супроць адмаўлення ўладальніка друкарні задаволіць патрабаванні рабочых аб павышэнні заработнай платы на 10 долараў і выдачы штомесячнай дапамогі ў 5 долараў.

* * *

26 сакавіка ў Калькуце 15 тысяч рабочых муніцыпалітэта аб'явілі забастоўку, патрабуючы павелічэння заработнай платы на 25 процантаў. 27 сакавіка паліцыя абстраляла групу бастуючых і арыштавала 18 удзельнікаў забастоўкі.

* *

Па словах парыжскай газеты «Эксцельсіёра», у Гаагэ закончана канструіраванне новага гідраплана-знішчальніка, які зможа звіваць хуткасць да 700 кіламетраў гадзіну.

* *

Газета «Эстадэ Сан Паола», якая выдаецца ў Сан Паола (Бразілія), перастала выходзіць прычыны арышту многіх членаў дакцыі. У Бразіліі арыштавана многа відных дзеячоў, у тым ліку амаль ўсе былыя дэпутаты парламента ад штата Сан Паола.

* *

Як паведамляе рыманскае інфармацыйнае бюро, народна-рэспубліканская партыя Турцыі несла рашэнне аб пабудове ў Анкары маўзалея, куды будуць перанесены останкі Атацюрка.



У ДЗЕНЬ ВЫБАРАЎ У БЕЛАСТОКУ

На здымку: член выбарчай камісіі 54-га ўчастка Пролетарскай акругі тав. Бабакова ўручае бюлетэні выбаршчыку Эпштэйну. (Фота Сапр)

ПА БЕЛАСТОКУ і ОБЛАСЦІ

ПАДРЫХТОЎКА Ў ІНСТЫТУТ БЕЗ АДРЫВУ АД ВЫТВОРЧАСЦІ

У другой палавіне лютага пры Беластоцкім аблсудзе арганізаваны шасцімесячныя курсы па падрыхтоўцы ў Мінскі юрыдычны інстытут без адрыву ад вытворчасці. Слухачы курсаў у саставе 22 чалавек паспяхова авалодваюць ведамі. Заняткі праводзяцца тры разы ў тыдзень.

Зараз аб'яўлен дадатковы набор на курсы. Новы набор будзе займацца па ўзмоцненай праграме, каб дагнаць стары састаў курсантаў.

НА БЫТАВЫЯ ТЭМЫ

На беластоцкім ізразцова-плітачным заводзе № 15 па ініцыятыве тав. Пінчукоўскага 15 лютага адкрыўся новы цэх па вытворчасці тавараў шырокага спажывання. Гэты цэх выпрабляе розную пасуду хатняга ўжытку: гаршчкі, жбаны, вазы, масляніцы, рэчы мастацкай афарбоўкі: цвяточніцы, настольныя лямпы, вазоны для кветак і іншыя.

Не гледзячы на кароткі тэрмін, цэх шырспажыву даў ужо на рынак Беластока 4000 гаршчкоў, 3000 жбаноў, 12 тон пасуды мастацкай пафарбоўкі.

Вельмі прыемна, што нашы гаспадарнікі праяўляюць клопаты аб бытавых патрэбах працоўных. Гэту ініцыятыву трэба ўсямерна падтрымліваць. Аднак тое, што зроблена цэхам, далёка не задавальняе попыту спажыўцоў.

Горсовету варта было-б падтрымаць ініцыятыву завода. Справа ў тым, што цэх шырспажыву не мае спецыяльна прыстасаванага памяшкання. Ён туліцца ў трухлявым хляве, няма дзе разгарнуцца.

Дырэкцыя завода некалькі разоў звярталася да старшыні горсовета тав. Гарэліка і начальніка планавага аддзела тав. Волкава з просьбай перадаць ім паблізу падыходзячае памяшканне. Але горсовет не знайшоў часу даць нават адказ на іх заяву.

Г. Лупсякоў.

НА БУДАЎНІЧАЙ ПЛЯЦОЎЦЫ ЦЭЛУЛОІДНАГА КАМБІНАТА

На працягу шасці год польскія ўлады будавалі Лаўненскі цэлулоідны камбінат у Скідзельскім раёне. Аднак, закончыць гэта вялікае будаўніцтва было не пад сілу польскім фабрыкантам. Апошнія годы будаўніцтва было прыпынена.

Толькі з устанаўленнем совецкай улады закіпела будаўнічая работа на пляцоўцы. Прыняты ўсе меры да таго, каб камбінат уступіў у строй у самым хуткім часе. Зараз будаўніцтва ў разгары. Яго размеры з кожным днём павялічваюцца. Толькі ў гэтым годзе на дабудовы камбіната асігнавана больш 5 мільёнаў рублёў.

ЗБОР ЖЫВІЦЫ

Смала хвойных дрэў (жывіца) — гэта вельмі каштоўны матэрыял. З яго вырабляюць каніфоль, скіпідар. Каніфоль ужываецца ў рознай прамысловасці — мылаварнай, лакафарбавай, папяровай. Каніфоль — экспартны прадукт.

У бягучым годзе на тэрыторыі заходніх абласцей БССР упершыню наладжваецца падсочка лесу для збору жывіцы. Гэтай справай займаецца арганізацыя Белхімлесу.

Зараз праходзіць энергічная падрыхтоўка да вясенняга сезона. 42 майстры-падсочнікі, якія прайшлі курсы, раз'ехаліся на месцы лесасек. Трэст будматэрыялаў заходніх абласцей БССР рыхтуе для збору жывіцы спецыяльную паліваную пасуду — прыёмнікі-варонкі ў колькасці двух мільёнаў штук. Да 10 красавіка з Ломжынскага завода № 4 чакаецца першы вагон прыёмнікаў, якія на заводах заходніх абласцей Беларусі вырабляюцца ўпершыню.

Адказны рэдактар Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ.

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: г. Беласток, будынак Аблвыканкома. Тэлефоны рэдакцыі: адказнага рэдактара — 22 (па камутатару аблвыканкома) і 49 (гарадскі), сакратарыята, партыйнага і совецкага аддзелаў — 23 (па камутатару аблвыканкома), прамысловага, сельскагаспадарчага, культурнага і інфармацыйнага аддзелаў — 17-62 (гарадскі). Тэлефон выдавецтва і аддзела аб'яў — 16-10. Тэлефон друкарні і начной рэдакцыі — 5-21.

Падпіску на газеты прымае «Саюздрук» (Тэлефон 5-14).

Упаўнаважаны аблліта № 449. 1-я дзяржаўная друкарня г. Беластока.